Источник: "Краязнаўчая газета" - 2013-04-18

# На тым тыдні

✓ **11 красавіка** ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбыўся **круглы стол, прысвечаны 20-годдзю з дня выхаду ў свет першага нумара «Беларускага гістарычнага часопіса»**.

За гады свайго існавання часопіс выпусціў 164 нумары агульным тыражом каля 400 000 экзэмпляраў. Тут друкуюцца навуковыя, навукова-папулярныя, метадычныя матэрыялы па гісторыі Беларусі і ўсеагульнай гісторыі. Часопіс уключаны ў Пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў. У ім друкаваліся артыкулы даследчыкаў больш чым з 20 краінаў свету.

✓ **12 красавіка** ў Нацыянальным цэнтры мастацкай творчасці дзяцей і моладзі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь адзначыў **50-гадовы юбілей заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь ансамбль песні і танца «Зорачка»**. У імпрэзе прынялі ўдзел сябры ансамбля – фальклорныя калектывы з Нідэрландаў, Малдовы і Беларусі.

✓ **12 красавіка** ў Нясвіжскім палацавым ансамблі адкрылі выстаўку **«Книжное наследие Радзивиллов»**. 90 рэдкіх кніг з княжацкай бібліятэкі на некаторы час вярнуліся ў сцены былой рэзідэнцыі «некаранаваных каралёў». Праект арганізаваны сумесна з Цэнтральнай навуковай бібліятэкай імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі. Пад час адкрыцця адбылася прэзентацыя каталога «Библиотека Радзивиллов Несвижской ординации XVII в.».

✓ **12 красавіка** ў Літаратурным музеі Максіма Багдановіча адбылася **другая імпрэза культурна-адукацыйнага праекта «Рэлікт»**, на якой быў прадстаўлены зборнік вершаў «Вянок» Максіма Багдановіча, што пабачыў свет 100 гадоў таму.

У межах праекта «Рэлікт» цягам года адбудзецца шэраг прэзентацыйных мерапрыемстваў, якія дапамогуць пазнаёміцца са скарбамі Літаратурнага музея Максіма Багдановіча. Сачыце за абвесткамі!